НАШ Магілёў

Кастрычнік, 2007 год
Незалежнае
грамадзка - палітычнае
выданьне Горада

17

# Жыве новая кааліцыя!

Пан Тадэвуш

**27 кастрычніка адбылася ўстаноўчая канферэнцыя Магілёўскай абласной кааліцыі аб'яднаных дэмакратычных сілаў, на якой прысутнічалі прадстаўнікі ўсіх палітычных партый і некаторых грамадскіх аб'яднанняў, за выключэннем партыі БНФ. У канферэнцыі прынялі ўдзел 24 дэлегаты з Магілёва, Магілёўскага раёна, Бялыніч, Шклова, Бабруйска, Кіраўска, Глуска, Асіповічаў і Горак. На канферэнцыі была абрана Каардынацыйная Рада абласной арганізацыі Аб'яднаных дэмакратычных сілаў, у склад якой увайшло 11 чалавек з розных палітычных партый.**

**Трэба адзначыць, што да моманту стварэння гэтай кааліцыі ў Магілёве існавала і існуе яшчэ адна абласная кааліцыя дэмакратычных сілаў, у склад якой уваходзяць прадстаўнікі БНФ, аргкамітэту Партыі Свабоды і Прагрэса, Свабоднага Прафсаюза Беларускага, некалькі прадстаўнікоў з АГП, БСДП (Грамада) і некаторыя сябры розных грамадскіх аб'яднанняў.**



Прэзідыум канферэнцыі



Удзельнікі каферэнцыі, фотаздымкі Андруся Воўкава

## Дзе два беларусы - там тры партыі

**З гісторыі непаразумення**

Справа ў тым, што яшчэ перад II-м Кангрэсам дэмакратычных сілаў, які адбыўся вясной гэтага года, у горадзе Магілёве існавала кааліцыя дэмакратычных сілаў, у склад якой уваходзілі ўсе прадстаўнікі дэмакратычных партый і грамадскіх аб'яднанняў горада.

Са слоў Юры Новікава, намесніка старшыні Свабоднага прафсаюза беларускага: "Кааліцыя была ўтворана перад выбарамі ў мясцовыя Саветы дэпутаў і добра функцыянавала. Мэтай яе стварэння было аб'яднанне агульных рэсурсаў, размеркаванне дэмакратычных кандыдатаў па акругах і аказанне ім дапамогі падчас выбарчай кампаніі".

Падчас выбарчай кампаніі, тыя, хто набраў пэўную колькасць подпісаў, станавіліся дэлегатамі на II-гі Кангрэс дэмакратычных сілаў. У Магілёве з гэтым узніклі пэўныя праблемы, бо ўтвораная ў Менку камісія па праверцы подпісаў забракавала вялікую колькасць подпісаў, якая была пададзена магілёўцамі і некаторыя актывісты так і не патрапілі на Кангрэса. Тады большая частка магілёўскіх дэмакратаў вырашыла байкатаваць гэтае мерапрыемства. Канферэнцыя, якая праходзіла ў Магілёве, перад Кангрэсам не здолела сабраць кворум і адпаведна яе ўдзельнікі не здолелі выказаць сваё афіцыйнае рашэнне ў дачыненні да пэўных пытанняў, якія павінны былі бы выносіцца на галасаванне на Кангрэсе.

На Кангрэсе дэмакратычных сілаў не быў абраны адзіны лідэр, а было абрана кааліцыйнае кіраўніцтва з прадстаўнікоў розных палітычных партый, якое пачало ствараць кааліцыі на месцах. Вось тутака і абвайстрыўся існуючы ўжо канфлікт, бо са словаў Юры Новікава: "Палітычная Рада прапаноўвала разбурыць існуючую кааліцыю і пабудаваць новую, адпаведна прынятым правілам і працэдурам АДС".

15 ліпеня, пасля Кангрэса дэмакратычных сілаў, прадстаўнікамі існуючай кааліцыі, ў Магілёве была праведзена Абласная канферэнцыя, на якой было прынята новае палажэнне і абрана Абласная Рада. У Канферэнцыі прыняла ўдзел 62 дэлегаты з розных рэгіёнаў Магілёўшчыны.

Гэтую кааліцыю не прызнала Палітычная Рада ў склад якой уваходзіць Беларускі Народны Фронт, Партыя камуністаў Беларуская, Аб'яднаная грамадзянская партыя, Беларуская Сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) і яшчэ некалькі грамадзкіх аб'яднанняў.

Для Юры Новікава, экс-старшыні Магілёўскай абласной арганізацыі БСДП (Грамада), супрацьстаянне з партыйным кіраўніцтвам Менска скончылася ягоным выключэннем з партыі.

Са слоў старшыні Магілёўскай абласной арганізацыі Аб'яднанай Грамадзянскай партыі Уладзімера Шанцава: "На "Абласной канферэнцыі", якая праходзіла 15 ліпеня мы не прысутнічалі, бо перад яе правядзеннем па сайтах з'явілася інфармацыя аб тым, што мы адмовіліся ўдзельнічаць у ёй і на сход, які адбыўся перад Канферэнцыяй мы не прыйшлі, але нас па-просту туды ніхто не запрашаў."

**Меркаванне новаўтворанай кааліцыі**

"Наша кааліцыя будзе прызнана ў Менску!" – гаворыць Аляксандр Каралёў, юрыст-консульт прасаюзу РЭП, дэлегат новаўтворанай кааліцыі.

"З другой магілёўскай кааліцыяй, - працягвае Аляксандр: мы працаваць пакуль не будзем. Яе прадстаўнікі не згаджаюцца працаваць з намі разам. Мы запрашалі іх прыйсці на нашу канферэнцыю, а яны адмовіліся. Узнікае яшчэ адно пытанне: "Хто ўваходзіць у тую кааліцыю, акрамя партыі БНФ і некаторых сябраў з іншых апазіцыйных партый?"

Іх кааліцыя прадстаўляе толькі пэўныя вузкія колы. Там няма прадстаўнікоў партый, якія ўваходзяць у рэспубліканскую кааліцыю. Наша кааліцыя будзе строга выконваць пастановы апошняга Кангрэсу дэмакратычных сілаў і працаваць па іх праграмных дакументах".

"Другая магілёўская кааліцыя ,- адзначае Аляксандр: лічыць, што яна мусіць працаваць па нейкіх іншых дакументах і прынцыпы нашай працы яны не падзяляюць. Перад гэтай канферэнцыяй і перад іхняй мы казалі, што трэба працаваць з людзьмі, ездзіць па рэгіёнах, праводзіць сустрэчы. Па-першае прадстаўнікі існуючай кааліцыі сказалі, што гэтага рабіць не трэба, а падругое – няма кааліцыі, калі няма кансенсуса. Існуючая кааліцыя лічыць, што толькі яны маюць рацыю. Мы не прымаем такую пазіцыю. Яны падтрымліваюць рух Мілінкевіча "За свабоду!". Хай назавуць сябе так і не пудраць іншым мазгі!"

**Меркаванне існаваўшай да гэтага моманту кааліцыі**

"У стварэнні новай кааліцыі, - гаворыць лідэр магілёўскай Абласной кааліцыі дэмакратычных сілаў Пётр Мігурскі,- я нічога дрэннага не бачу. Калі ёсць людзі, якія лічуць што менавіта ў такім фармаце павінны праводзіцца дэмакратычныя пераўтварэнні, то калі ласка. Насцярожвае іншае, што калі мы стваралі Абласную кааліцыю дэмакратычных сілаў, то яны чамусці праігнаравалі гэты момант і, больш за тое да гэтага часу працягваюцца спробы прынізіць людзей, якія ўваходзяць у нашу кааліцыю. Хаця мы дамовіліся, што паміж сабой не ваюем і гэтае слова мы стрымліваем, не гледзячы на шматлікія выпады з іхняга боку".

"Што за БСДП (Грамада) уступіла ў гэтую кааліцыю, - абураецца спадар Мігурскі,- калі яна ў нашай кааліцыі!? Хто там з'яўляецца ўвогуле кіраўніком? Калі так і надалей будзе працягвацца штучна створанае супрацьстаянне, то карысці ад гэтага не будзе нікому. Штучнасць новай кааліцыі заключаецца ў тым, што яна ініцыянавана Палітрадай АДС. АГП таксама уваходзіць у склад нашай кааліцыі, а ў новаўтвораную - толькі абласны старшыня АГП Уладзімер Шанцаў. Яшчэ адно пытанне датычыцца таго, чаму БНФ было выключана з гэтага працэса".

"Я не разумею, - адзначае Пётр Мігурскі,- чаму ў Магілёўскай вобласці ўтварылася такая сітуацыя, калі дэмакраты змагаюцца адзін з адным. Мы адкрыта заяўляем, што нашы дзверы адчынены для ўсіх. Таму мы запрашаем іх удзельнічаць у сумесных мерапрыемствах. Гэта ж таксама нашыя людзі!



**Юры Новікаў, намеснік старшыні Свабоднага Прафсаюзу Беларускага**

## Прафсаюз і сацыял-дэмакратычная партыя – гэта родныя браты!

**Чаму я ў апазыцыі да сучаснай улады?**

Так склалася ў жыцьці. Я працаваў на заводзе "Зеніт" і калі ў пачатку 90-х пачаўся развал СССР, перасталі плаціць заробкі, пачаліся стыхійныя пратэсты працоўных супраць таго, што адбывалася ў краіне. Я воляй лёсу апынуўся ў шэрагах Свабоднага Прафсаюзу. Ад гэтуль усё й пачалося. Мы змагаліся за свае эканамічныя правы. Мы зразумелі, што ўсё залежыць ад нашай улады.

**З чаго ўсё пачыналася?**

Пачыналася з таго, што мы вылучылі патрабаваньні да адміністрацыі прадпрыемства. Яно не пайшло нам на саступкі. Тады каля 400 рабочых выйшла на вуліцу да Дому Саветаў з патрабаваньнямі выплаціць заробак за апошнія два месяца. Другое патрабаваньне было - зьмяніць дырэктара прадпрыемства. Да нас выйшаў тагачасны старшыня аблвыканкама Кулічкоў і запэўніў нас у тым, што ўсё будзе зроблена. Заробак выплацілі й заводу далі, нават, абаротныя сродкі.

**Наколькі цяжка ўвесь час знаходзіцца пад ціскам?**

У краінах захаду ўлада не ўмешваецца ў правы прафсаюзаў. Улада там дзейнічае як арбітар. У нас жа ўсё зводзіцца да ўлады. Суд становіцца на бок прадпрыемства. Актывістаў перасьледваюць. На прадпрыемстве, за змаганьне за свае правы, ты можаш патрапіць пад скарачэньне, альбо табе па-просту не працягнуць кантракт.

Крыўдзіць сябе я ніколі нікому не даваў. Я судзіўся з адміністрацыяй завода. Выйграваў суды. Я быў вельмі дысцыплінаваным, таму да працы ставіўся вельмі адказна, не парушаў нутраны распарадак.

**Чаму я стаў сацыял-дэмакратам?**

Пасьля таго, як я зьездзіў у Нямеччыну й дазнаўся аб тым, што сацыял-дэмакратычная партыя прадстаўляе інтарэсы працоўных я ўступіў у сацыял-дэмакратычную партыю, бо прафсаюз і сацыял-дэмакратычная партыя – гэта родныя браты.

Будучы сябрам партыі я шмат разоў затрымліваўся, але не было ніводнага суда з гэтай нагоды. Трэба ўмець размаўляць з міліцыяй і паказваць ім, што ты чалавек кемлівы.

**Гутарку вёў Вітольд Няўрыда**

# Вялікі Кастрычнік...

Вітольд Няўрыда

**7 лістапада (25 кастрычніка па старому стылю) спаўняецца 90 год Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. У Менску святочныя мерапрыемствы прызначаны на трэцяе, чацвёртае ды пятае кастрычніка. З гэтай нагоды галоўны камуніст Расіі таварыш Зюганаў прыедзе ў беларускую сталіцу, каб адсвяткаваць гэты памятны дзень. Складаецца ўражанне, што лепшага месца ва ўсім свеце дзеля гэтага святкавання проста не знайсці, але на справе гэта і атрымоўваецца так.**






Сьвечкі ля крыжоў на курапацкай алеі, фота Свабоды




Памятны крыж у Лошыцкім Яры, фота Свабоды

У Беларусі гэты дзень з'яўляецца выхадным, а большасць беларусаў, не гледзячы на амаль 75-гадовую савецкую спадчыну, чамусці не спяшаецца выстройвацца ў калоны і з партрэтамі правадыра ўсіх часоў і народаў таварыша Леніна маршараваць па цэнтральных праспектах Менска. Для беларусаў – гэта дадатковы выхадны і магчымасць прыемна правесці вольны час. Гэта ў першаю чаргу датычыцца маладога пакалення, якое паспела нарадзіцца за часамі незалежнасці Беларусі і не гледзячы на сваё, у пераважнай большасці, чырвона-зялёнае выхаванне, амаль не памятае, што гэта за дзень і чаго яго святкуюць.

Беларусь з кожным годам аддаляецца ўсё далей і далей ад камуністычнай гісторыі. У першаю чарго гэта адбываецца ў розумах людзей, бо за часы незалежнасці краіны шмат беларусаў здолела пабываць у розных краінах свету і правесці параўнальны аналіз, свядома выбраўшы для сябе Еўрапейскі шлях развіцця.

Асаблівасцю ўсіх сучасных дзяржаўных святаў з'яўляецца іх безаблічнасць. Калі адкінуць іх назвы – дзень Незалежнасці 3 ліпеня, дзень Працы 1 траўня, дзень Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі 7 лістапада, Дзень горада, Дажынкі і г. д., то народ і не ўзгадае, што сёння за свята, бо выглядаюць яны аднолькава і праходзяць амаль па аднаму і таму самаму сцэнару.

Да дня беларускай пісьменнасці ў Шклове (2 верасня) у горадзе былі перайменаваныя дзьве цэнтральныя вуліцы ў гонар народных беларускіх пісьменнікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа. Прычым раней гэтыя вуліцы ўшаноўвалі памяць Маісея Урыцкага і Карла Маркса. Адзін з чыноўнікаў даў інтэрв'ю ў якім адзначыў, што ніхай лепей гэтыя вуліцы будуць насіць імёны беларускіх пісьменнікаў, чым нейкіх замежных рэвалюцыянераў. Гэта вельмі знакавае інтэрв'ю, бо яно паказвалася па АНТ, аднаму з цэнтральных беларускіх тэлеканалаў. Яно можа сведчыць пра тое, што беларускі ўрад паступова пачынае станавіцца на незалежніцкія пазіцыі і за мэту ставіць будаўніцтва нацыянальнай дзяржавы.

Але гэта толькі першыя маленькія асцярожныя крокі, бо наша Беларусая рэчаіснасць яшчэ вельмі багата рознымі камуністычнымі сімваламі часоў савецкай эпохі. Гэта назвы вуліц у гонар рэвалюцыянераў і савецкіх дзеячоў, помнікі безаблічнай савецкай эпохі, традыцыйныя савецкія святы і чырвона-зялёная сімволіка, распрацаваная пасля другой сусветнай вайны расіянінам у падарунак беларускага народу. Гэта таксама і назовы некаторых гарадоў, перапісаная пад савецкую ды прарасійскую беларуская гісторыя, русіфікаваная беларуская мова, якая як не дзіўна, працягвае сваё існаванне, хаця і ў інтэлектуальнай рэзервацыі, чакаючы свайго бліскучага выхаду з яе.

Больш за 12 гадоў першаму прэзідэнту Беларусі спатрэбілася на тое, каб з інтэрнацыяналіста і касмапалітэна стаць амаль нацыяналістам і задумацца над будаўніцтвам сапраўднай беларускай дзяржавы. Застаецца адзначыць, што шкада часу, які быў упушчаны і шкада ягоных намаганняў, якія ён затраціў на змаганне з беларушчынай і беларускай інтэлігенцыяй.

Асабіста для мяне камунізм і рэвалюцыя - гэта мільёны ахвяраў ва ўсім свеце. Гэта таксама і беларускія Курапаты, дзе ляжыць каля 200 000 тысяч чалавек, пераважна беларуская інтэлігенцыя, гэта і Сібір і лагера, куды было саслана і выселена каля 1 000 000 беларусаў, гэта МДБ і КДБ, НКВД, СМЕРШ і ГУЛАГ, гэта Ленін і Сталін, гэта і Другая Сусвеная вайна, дзе беларусы сталі разменнай манетай і ваявалі па два бакі магутных таталітарных сістэм.

Таму, напэўна "вялікія" камуністы сучаснай эпохі таварышы Калякін ды Зюганаў, у прыватных размовах прыкідываюцца сацыял-дэмакратамі, бо цяжар камуністычнай эпохі з кожным годам цягне ўсё глыбей і глыбей уніз, а плаваць та трэба...

Савецкасць, савок, гомасавецікус – гэта пьянае маргінальнае быдла на нашы вуліцах, амаль спітая і занядбаная беларуская вёска, туніядцы і лайдакі, амаральныя безкультурныя інтэлектуальна неразвітыя аднабокія асобы. Пералік можна працягваць і далей, але лепей заахвоціць увагу на пазітыўных момантах і шукаць шляхі са склаўшайся сітуацыі.

А без удзелу ў палітычным жыцці пакінутай па за ім нацыянальнай беларускай інтэлегенцыі гэты выхад бачыцца вельмі сумнеўным.

## У нашай краіне небясьпечна быць проста чалавекам



Алесь Асіпцоў,
незалежны журналіст

**Я думаю, што ў нашай краіне небясьпечна быць, у прынцыпе, проста чалавекам, які ўмее разважаць, аналізаваць, прымаць рашэньні, а яшчэ чалавекам, які мае сваю ўласную пазыцыю, якая адрозьніваецца ад агульнапрынятай афіцыйнай.**

Што да журналістыкі, то я думаю, што існаваньне самой незалежнай журналістыкі – гэта ўжо сама па сабе небясьпечная рэч. Журналістам быць вельмі небясьпечна ў нашай краіне, бо з аднаго боку існуе такая рэч, як нутраны цэнзар і час ад часу табе кажуць: "Вось гэта пішы так, а вось гэта гэтак!", а з другога боку ты, як чалавек, які займаецца пэўнай прафэсійнай дзейнасьцю, проста ня маеш ясна абазначанага заканадаўства. Я маю на ўвазе, што ты можаш рабіць, а што не. Журналіст, які дзейнічае ва ўмовах нявызначанага заканадаўства ўвесь час спрабуе схаваць тыя войстрыя вуглы ў той ці іншай падзеі, каб не прыцягнуць да сябе ўвагі пэўных праваахоўчых органаў, у тым ліку Камітэту Дзяржаўнай Бясьпекі.

Інфармацыю атрымаць ня цяжка. Іншая рэч, што яе цяжка спраўдзіць, то бок атрымаць камэнтары ад афіцыйнага боку тых чыноўнікаў, якія ў той ці іншай ступені фігуруюць у гэтай інфармацыі. Праблема ў тым, што калі чыноўнікі не фігуруюць у матэрыяле, то такі матэрыял ня будзе цалкам аб'ектыўным. Па вялікаму рахунку ўлада ўжо даўно адгарадзілася ад журналістыкі. Тыя журналісты, якія працуюць у дзяржаных СМІ, па вялікаму рахунку, выклікаюць спачуваньне, бо з аднаго боку, яны разумеюць дзе й на каго яны працуюць, а з другога боку, яны маюць пэўныя ўстаноўкі рабіць той ці іншы матэрыял, але з пэўнай скіраванасьцю.

Яскравых адназначных прыкладаў таго, што на мяне цісне ўлада, дзякуй Богу, няма. Але вось само чаканьне таго, што ціск будзе, безумоўна адчуваецца. Адчуваньне агульнай небясьпекі зьвязана з тымі нюансамі, зь якімі прыходзіцца працаваць журналісту. Калі браць Магілёў, дзе няма публічных сродкаў масавай інфармацыі, то зразумелая рэч, што на цябе зьвяртаюць асаблівую ўвагу. Дастаткова толькі прычапіць бэйдж, узяць дыктафон у рукі, зрабіць намаганьне й пачаць гаварыць зь мінакамі на вуліцы й адразу ж на цябе зьвяртаюць увагу.

Гутарку вёў Пан Тадэвуш

## Палітычны пераслед ці звычайнае хуліганства???

Ян Чыгірдот

**У суботу, 27 кастрычніка пры выхадзе з пад'езда былі збіты актывісты моладзі БНФ Алесь Анісімаў і Канстанцін Яўсееў.**

"Мы выйшлі з пад'езду вечарам, разам з Алесем. - распавядае Косця: Каля пад'езду стаяла блізу 15 чалавек. Гэта былі здаровыя хлопцы, ўзростам не менш 25 год. Не паспелі мы зрабіць і аднаго кроку, як некаторыя з іх накінуліся на нас і пачалі нас збіваць".

"Білі ў асноўным па нырках і рэбрах, - узгадвае Косця: Толькі некаторыя ўдары траплялі па твары. У нас на целе, на наступны дзень, з'явіліся сінякі і ранкі".

Ад невядомай кампаніі хлопцы здолелі выратавацца толькі бегствам.

Перад тым як выйсці з пад'езду, хлопцы па тэлефону дамаўляліся аб наступнай сустрэчы, са сваімі сябрамі на адным з апазіцыйных офісаў.

Зараз яны вырашаюць што рабіць, расцэньваць гэты выпадак як запужванне і палітычны пераслед, ці проста як звычайнае хуліганства пэўных асобаў. Напярэдадні ў хлапцоў размова з магілёўскімі праваабаронцамі.

## Вы за Аляксандра Лукашэнку?

### Вам сюды!

**Рэдакцыя газэты "НАШ Магілёў" шукае прыхільнікаў курсу дзеючай улады, для адкрыцьця новае рубрыкі "Чаму я ЗА!". Калі ласка, зьвярніцеся да нас. Мы дапаможам вам выказаць сваю кропку гледжаньня.**

# Народные названия домов

mycity.by



**«Дом Советов»** (арх. И. Лангбард) возведен в 1938—1940 гг. и занимает центральное место на площади им. Ленина. Главным фасадом он выходит на площадь, имеет пирамидальный вид с ритмическим нарастанием объемов к центру. Объемы завершены высокими парапетами, на центральном — барельефный образ герба уже не существующей страны — БССР. Центром композиции является 8-этажный объем, соединенный с 7-этажными частям, выступающими на площадь постепенно переходящими в 5-этажные полукруглые корпуса, которые своими крыльями образуют широкий курдонер перед зданием. Разновысотность строения дома придает постройке ритмический характер, что ещё более усиливается строгим ритмом лопаток на всю высоту здания.



**«Дом Сталина»** построен в 1939 году к 60-летию со дня рождения «вождя» для рабочих металлокомбината. В 1948-м году дом восстановлен, а в 70-х годах — реконструирован. Именно тогда все жилые помещения с первого этажа были перенесены в надстроенный сверху жилой 5-й этаж. Архитектурный облик здания не пострадал, он стал равным по высоте соседнему дому. На специально оборудованном первом этаже с того времени размещается городская библиотека им. К.Маркса.



**«Дом артистов»** построен в 1954 году. Это пятиэтажное жилое здание, на первом этаже которого сейчас находится ряд магазинов, в том числе и торговый центр «Бум».



**«Дом 90»** построен в 1938—1940 гг. по проекту архитекторов А. Воинова и А. Брегмана и представлял собой 5-этажный жилой дом с надстройкой мансардного этажа. Сейчас это 6-этажное здание с 7-этажным угловым объемом. Седьмой этаж надстроен во время капитального ремонта в 70-е годы. Выделяется монументальностью и целостностью объемно-пространственной композиции. В декоративном решении фасадов использованы плоские лопатки, между ними — прямоугольные оконные проемы.

Планировка всех этажей изменена во время последнего капитального ремонта, законченного в 2003 году. Тогда были демонтированы конструкции кровельного покрытия, деревянные междуэтажные перекрытия, внутренняя продольная стена, а также конструкции дымоходов печного отопления до уровня существующего железобетонного перекрытия над подвалом и над первым этажом в одной из секций. При этом полностью сохранены наружные несущие стены из глиняного кирпича, конструкции бутобетонных фундаментов и существующие перекрытия из монолитного железобетона, а также внутренние стены лестничных клеток. В образовавшееся пространство, после соответствующего обследования и определения несущей способности кирпичной кладки стен, фундаментов и оснований под ними, был встроен неполный железобетонный каркас с плоскими сборно-монолитными перекрытиями из многопустотных плит. Это позволило расчистить внутренний объем здания и обеспечить гибкую планировку квартир, офисов, предприятий торговли и др. помещений, с возможностью ее изменения на любой стадии строительного процесса и эксплуатации. Такое решение разработано в УП «Институт БелНИИС» и впервые было реализовано при реконструкции «Дома 90».

Это здание — памятник жилищной архитектуры. А получил дом такое название, вероятно, в связи с тем, что угол между двумя его частями составляет 90 градусов.



Политика индустриализации и бурное развитие промышленности с конца 20-х годов вызвали значительное увеличение городского населения и необходимость возведения многоэтажного жилищного фонда. Первым многоэтажным секционным жилым домом в Могилеве является 3—4-этажный дом № 22 на ул. Первомайской (горожане-старожилы называют его **«Домом Ленина»**), построенный в 1929—1930 гг. по проекту инженера Ульянова. Конструктивную схему здания составляют три продленные несущие стены. Вокруг каждой лестничной площадки размещены по две 4-комнатные квартиры. Это здание — яркий пример архитектуры советского конструктивизма 20-х — 30-х годов. До капитального ремонта в 70-х годах сверху над парапетом просматривалась надпись в штукатурке **«Дом имени Ленина»**. Сейчас здесь на первом этаже размещается ресторан «Виктория».



С конца 20-х годов в жилищном строительстве Беларуси был взят курс на строительство многоэтажных домов для рабочих. Одним из первых в Могилеве появился 3-этажный **«Дом Буденного»**. Дом назван так потому, что был сдан в эксплуатацию ко дню рождения маршала СССР С.М. Буденного« и размещался на ул. Буденного. Построен он в стиле конструктивизма и является одной из первых попыток в советское время создания благоустроенного жилья.



Датой постройки **«Дома летчиков»** считается 1950 год. Это угловое пятиэтажное здание, с двумя надстроенными этажами, находящееся возле подземного пешеходного перехода в центре города.



**«Китайская стена»**. Дом построен в 70-х годах по проекту архитекторов И. Фролова и Г. Дорохова. Расположен в 120 м от линии застройки улицы, что образует пешеходную зону, благоустроенную газонами и декоративными бассейнами. Состоит из нескольких объемов: первый 9-этажный — главным продленным фасадом выходит на ул. Первомайскую, второй 12-этажный — соединен с торцом первого и выходит на ул. Буденного. К главному фасаду присоединены два 2-этажных объема — в которых сейчас размещаются магазин «Евроопт» и ресторан «Габрово». Жилые этажи решены единым архитектурным приемом — разной длины балконы с вертикальными боковыми перегородками придают главному фасаду объемность и целостность. Стены облицованы плиткой, что создает насыщенную гамму фасада. В обработке цоколя использован гранит. В доме 228 квартир, которые ориентированы на обе стороны дома, балконы — со стороны главного и дворового фасадов. Жилой дом — пример советской архитектуры 70-х годов.



**«Серый дом».** Построено здание в 1939 году. Именно здесь когда-то жил известный певец Борис Моисеев. Сейчас на первом этаже дома находится магазин «Диамант».



**«Курская дуга».** Дату постройки одной из частей дома, под номером 69, относят к 1959 году, вторую — к 1970. Сейчас на первом этаже этого жилого шестиэтажного дома находятся магазины «Изумруд» и «Фиалка».



**«Дом ученых»** находится в глубине двора, образованного домами, в которых раньше находились магазины «Дом одежды» и «Мир». Построен в 1971 году.



**«Магаданский дом».** Эта постройка представляет собой пятиэтажное жилое здание. Годом возведения части под номером 16 считается 1963 год, а под номером 18 — 1962 год.



**«Свечка».** Построенный в 2004 году жилой 16-этажный дом получил свое народное название благодаря высоте и «стройности».

## Ожидаются перебои с хлебом

Андрей Волков

**Учитывая стоимость зерна на Европейском рынке и нехватку денег в беларуском бюджете, можно ожидать перебоев поставок хлеба в могилёвские магазины, - сообщил редакции "НАШ Магілёў" анонимный представитель местной власти.**

Произошедшие в этому году пожары во Франции привели к дефициту зерна в Европе. Неурожайным по зерновым выдался год и для Украины.

Ранее, в магазинах города явно ощущался недостаток молока. Как сообщает источник, это вызвано тем, "что у нас в магазине килограмм сухого молока стоит 2000 рублей, а в Европе три евро (около 10 000 рублей, - от ред.)".

В приграничных районах Беларуси введены ограничения на покупку населением молока. Однако, на государственные поставки продовольствия в другие страны, ограничений не предусмотрено.

P. S. В 1917 году, в Санкт-Петербурге из булочных исчез белый хлеб. Люди вышли на улицы и через три дня произошла революция.

# No comments

Работы па адбудове Магілёўскай Ратушы, фота Вітольда Няўрыды



generation.by

## У Беларусі заведзена ўжо амаль 100 крымінальных справаў за адмову ехаць па разьмеркаваньні

**Распачатыя крымінальныя справы па фактах непрыбыцьця да месца разьмеркаваньня супраць 65-ці выпускнікоў ВНУ і 34-х выпускнікоў сярэдніх спэцыяльных навучальных установ.**

Беларускі бюджэт працягваецца папаўняцца за кошт сродкаў студэнтаў, якія не пажадалі працаваць прызначаныя 2 гады па разьмеркаваньні. Начальнік упраўленьня вышэйшай і сярэдняй спэцыяльнай адукацыі Мінадукацыі Юры Міксюк на прэс-канфэрэнцыі 25 кастрычніка ў Менску паведаміў, што ў Беларусі распачатыя крымінальныя справы па фактах непрыбыцьця да месца разьмеркаваньня супраць 65-ці выпускнікоў ВНУ і 34-х выпускнікоў сярэдніх спэцыяльных навучальных установ. Затраты на навучаньне ўжо кампэнсавалі 16 выпускнікоў ВНУ і 7 выпускнікоў ССНУ.

Яшчэ ў верасьні Міністэрства адукацыі паведамляла толькі пра 12 выпускнікоў, што адмовіліся ехаць па разьмеркаваньні.

Сп. Міксюк распавёў таксама, што тэрмін працы па прымусовым разьмеркаваньні не павялічыцца, то бок застанецца 2 гады замест узгаданых 5-ці. А праект новага палажэньня аб разьмеркаваньні, над якім працуе міністэрства, мусіць толькі ўдакладніць і ўрэгуляваць палажэньні па працэсу разьмеркаваньня, вяртаньня студэнтамі сродкаў і ахапіць палажэньні Працоўнага кодэкса Беларусі, а таксама адпавядаць закону «Аб вышэйшай адукацыі», які ўступіць у сілу 20 студзеня 2008 года.

Сёлета каля 22 тыс. з 70 тыс. выпускнікоў ВНУ падпалі пад разьмеркаваньне. Прыблізна 6% зь іх атрымалі права на свабоднае працаўладкаваньне гэта інваліды, дзеці інвалідаў, а таксама выпускнікі, якія маюць дзяцей ва ўзросьце да трох гадоў, і некаторыя іншыя катэгорыі. У адпаведнасьці з Палажэньнем да іншай катэгорыі адносяцца таксама цяжарныя на момант разьмеркаваньня студэнткі і жонкі/мужы супрацоўнікаў МУС, КДБ і г.д.

Чыноўнік з Мінадукацыі таксама паведаміў, што сёлета па ўласным жаданьні былі разьмеркаваныя 12,5% маладых спэцыялістаў, якія вучыліся на платнай аснове.

# Мова таксама мае гены

**Лінгвісты называюць разьвіцьцё мовы эвалюцыяй. Дасьледчыкі матэматычнымі мэтадамі пацьвердзілі, што словы па сваёй аснове нагадваюць гены і падпарадкоўваюцца тым жа самым законам, што дзейнічаюць і ў прыродзе.**

Дзьве дасьледчыцкія каманды незалежна адна ад адной пацьвердзілі статыстыку «працяглясьці жыцьця» мовы.

Вынікі дасьледаваньняў, зьмешчаныя ў навуковым часопісе «Nature», можна перадаць простай формулай: чым часьцей слова ўжываецца штодзённа, тым радзей яно будзе зьмяняцца.

«Пэрыяд паўраспаду няправільнага дзеяслова прапарцыйны квадратнаму кораню часьціні яго ўжытку», кажа адзін з дасьледчыкаў Erez Lieberman.

Навуковец Erez Lieberman (Harvard University) фэномэн эвалюцыі ў мове дасьледуе матэматычнымі сродкамі. Ён задумаўся над пытаньнем, што прыродная сэлекцыя мае ўплыў як на мовы, так і на ідэі.

Са сваімі калегамі ён дасьледваў зьмены формаў мінулага часу ангельскіх няправільных дзеясловаў за апошнія 1500 год. Яго каманда аналізавала 177 дзеясловаў, формы мінулага часу якіх каля 1200 год таму ў старажытнаангельскай мове ўтвараліся не па правілах. Ужо ў XII XV стагодзьдзі з гэтых дзеясловаў няправільна спрагаліся 145, а ў сучаснай ангельскай мове засталося зь іх толькі 98 дзеясловаў. Усе астатнія дзеясловы за гэты час перайшлі ў групу дзеясловаў, якія ў формах мінулага часу атрымліваюць тыповы канчатак ed.

Другая дасьледчыцкая група на чале з Mark Pagel (University of Reading) параўноўвала словы, якія ў розных мовах маюць адно і тое ж значэньне. Аказваецца, што такія часта ўжывальныя словы як, напрыклад, лічбы, часта ў розных мовах гучаць падобна. Яшчэ адзін прыклад, вада, Wasser (па-нямецку), Watter (па-ангельску), Vatten (па-швэдзку). А малаўжывальныя словы знаходзяць у розных мовах меней падабенстваў.

Lieberman і яго каманда думаюць, што сваёй формулай яны змогуць прадказаць, якія з ангельскіх дзеясловаў пачнуць хутка зьмяняцца. Так, няправільныя дзеясловы «to be» і «to have» пэўна ніколі не набудуць асаблівасьці правільных дзеясловаў, то бок канчатак -ed ў формах мінулага часу. На думку дасьледчыкаў, наступным дзеясловам, які згубіць свой статус няправільнага дзеяслова, будзе дзеяслоў «to wed» (жаніцца). Мінулы час гэтага дзеяслова яшчэ «wed», але ў хуткім часе гэтая форма можа гучаць як «wedded».

generation.by




## Будучыня чалавецтва: Двухмэтровыя волаты, правячая эліта і тупыя гобліны

**Што будзе з чалавецтвам у 3000 годзе? Дасягне фізычнай вяршыні - прадказвае эвалюцыяніст Лёнданскай школы эканомікі Олівэр Кары. А яшчэ праз 10 000 год людзі разьдзеляцца на два віды: прывабную і разумную правячую эліту і на бязмозглых, жахлівых гоблінаў.**

Олівэр Кары (Oliver Curry) вядомы эвалюцыяніст Лёнданскай школы эканомікі. Ён лічыць, што сваёй фізычнай вяршыні чалавецтва дасягне ў 3000 годзе. Сярэдні чалавечы рост будзе каля 2 мэтраў, а працяглясьць жыцьця 120 год.

На зьнешні выгляд нашых вельмі далёкіх нашчадкаў паўплываюць дасягненьні плястычнай хірургіі: у мужчын рысы твару стануць сымэтрычнымі, мужчынская годнасьць - яшчэ больш годнай:), а голас панізіцца.

Жанчыны змогуць забыць пра эпіляцыю: валасы застануцца толькі на галаве і будуць бліскучымі і густымі. А мужчыны ня будуць ведаць куды глядзець: у вялікія вочы або на вялікі бюст.

Зьнікнуць і расавыя адрозьненьні усе, як адзін, будуць раўнамернага кававага колеру.

Але доўжыцца тое будзе ня доўга: залежнасьць ад тэхналёгіяў прывядзе да драматычных і непазьбежных зьменаў. Здарыцца гэта праз год 10 000 пасьля фізычнага роскввіту чалавецтва. Лекі аслабяць чалавечы імунітэт і дарослыя стануць усё больш падобнымі да дзяцей.

У выніку людзі разьдзеляцца на тых, у каго ёсьць усё, і тых, хто ня мае нічога.

Даклад Олівэра Кары, які нагадвае зьмест кніжкі нашага дзяцінства «Незнайка на Луне», бый падрыхтаваны для мужчынскага тэлеканала Bravo і выклікаў шырокі рэзананс у Вялікабрытаніі.

## Апублікаваны сьпіс 100 геніяў-сучасьнікаў

**Апытанкай займалася брытанская кампанія Synectics. Па выніках, краінай з самай вялікай колькасьцю геніяў на душу насельніцтва стала Вялікабрытанія. У топ-100 ёсьць і навукоўцы, і палітыкі, і пісьменьнікі, і людзі мастацтва, і спартоўцы. На першым месцы - «бацька» ЛСД, на апошнім - рэжысэр «Крымінальнага чытва».**

Міжнародная кансалтынгавая кампанія Synectics склала сьпіс сотні геніяў. Кампанія разаслала лісты чатыром тысячам брытанцаў з просьбаю адзначыць 10 геніяў-сучасьнікаў. Крытэры адбору былі наступнымі: зьмена парадыгмы, прызнаньне грамадзкасьцю, моц розуму, дасягненьні і культурніцкае значэньне.

Кампанія атрымала 1100 намінантаў з усіх сфэраў жыцьця. Прычым, толькі 60 адсоткаў былі яшчэ жывыя.

Ня дзіва, што 60 адсоткаў асобаў, пазначаных апытанымі, былі брытанцамі або амэрыканцамі апытанка праводзілася сярод брытанцаў.

Рускіх геніяў у сьпісе апынулася аж тры: Грыгорый Перэльман (матэматык, 9 месца), Гары Каспараў (шахматыст, 25 месца), Міхаіл Калашнікаў (стваральнік аўтамата Калашнікава, 83 месца). На жаль, у сьпісе няма аніводнага беларуса.

Пяцёрка лідэраў выглядае



Альбэрт Хофман, “Бацька” ЛСД

хімік, філёзаф. Швэйцарыя. Зараз яму 101 год, яго называюць «бацькам» ЛСД;

Цім Бэрнарс-Лі навуковец. Брытанія Сярод ягоных вынаходніцтваў - URI, URL, HTTP, HTML, а галоўнае WWW;

Джордж Сорас інвэстар і фундатар, ЗША;

Мэт Грэнінг сатырыст і аніматар, ЗША. Той самы, які прыдумаў Сымпсанаў;

Нэльсан Мандэла палітык і дыплямат, Паўднёвая Афрыка. Адзін з самых вядомых змагароў за правы чалавека, Нобэлеўскі ляўрэат 1993;

Фрэдырык Сэнгар хімік, Брытанія. Двойчы ляўрэат Нобэлеўскай прэміі па хіміі.

Сярод сотні геніяў таксама такія асобы, як Далай Лама, Стывен Спілберг, Гаральд Пінтэр, Прынц, Мухамад Алі, Генры Кісінджэр, Мэрыл Стрып, Пол МакКартні. Закрывае сотню геніяў Квенцін Таранціна.

НАШ Магілёў
Незалежнае грамадзка - палітычнае выданьне Горада
Выдавец Андрусь Воўкаў, дырэктар Вітольд Няўрыда, карэктар Лех Валіцкі.
Надрукавана на ксэраксе ў горадзе Магілёве. Наклад: 299 ас.
Кантакт: Магілёў, 212017, а/с 46
Gazetanm@yandex.ru
Тыражаваньне й распаўсюд усімі зацікаўленымі асобамі дазваляецца й вітаецца. Распаўсюд бясплатны.